## Сокал-пустальга – птушка 2010 года.

Сокал-пустальга (па-руску «пустельга»). У народзе гэтую прыгожую і шуструю птушку называюць з пяшчотай — шулячок, аролак. І, канечне ж, ёсць за што. Пустальга любіць адкрытыя ландшафты, і калі загняздуецца паблізу дачных участкаў і пасеваў, на ўскраінах вёсак і хутароў, то, несумненна, прынясе вялікую карысць, знішчыўшы мноства шкодных насякомых і мышападобных грызуноў. Такога ўдалага паляўнічага яшчэ трэба пашукаць! Невыпадкова беларускія вучоныя, рыхтуючы матэрыялы для вызначальніка “Птушкі Беларусі”, далі пустальзе звычайнай сучасную навуковую назву — сокал-пустальга, бо дзёрзкай птушка цалкам адпавядае сакаліным якасцям. палеі імклівы, вочы зоркія, дзюба і кіпцюры моцныя. У фальклорнай песеннай і паэтычнай традыцыі сокал сімвалізуе справядлівую ратную справу: «Не крумкач, а сокал на плячы...» Зноў жа, сокалам адвеку казываюць смелага і адважнага малайца, не кажучы ўжо пра тое, што ў абрадавых і валачобных песнях птушка з роду драпежнікаў вылучаецца як надзейны, ледзь не казачны, містычны памочнік ваяра ці паляўнічага. Праўда, якога-небудзь пустога, легкадумнага чалавека жартаўнікі могуць трапна абазваць пустальгой, але гэта не што іншае, як гульня слоў, і нічога агульнага з сапраўднай птушкай-пустальгой абразлівая мянушка не мае.

Дык хто ж ён такі, любімы ў народзе шулячок, аралок? Драпежная птушка сямейства сакаліных, прычым пустальга — сокал дробны. Даўжыня цела каля 36 см, маса да 275 г. На Беларусі пашыраны пералётны від, які рэгулярна трапляецца па ўсёй тэрыторыі. Афарбоўка пер'я рыжа-бурая з чорнымі ўкрапінамі, галава і доўгі хвост маюць шырае адзенне. Крылы ў палёце серпападобныя, дзюба вострая, акругляшчэ да прыходу сапраўднага майскага цяпла ў гняздзе сокала-пустальгі з'яўляюцца першыя кладкі, у якіх бывае ад 4 да 8 авальных вохрыстых яек с бурымі плямкамі. Наседжнанне доўжыцца каля 30 сутак. На гняздзе звычайна сядзіць самка, а гаспадар у тэты час заняты пошукам корму. Передача ежы, як і ў чаплі белай, супрэваджаецца абавязковым рытуалам. Прынесці корм, сокал гучна кліча сяброўку, а тан адказвае пяшчотным піскам. Пакуль яна палуднуе, кладку нядоўга наседжвае самец. І такіх приемных сустрэч у гнездавой пары бывае тры-чатыры надзень. Птушаняты выводзяцца ўжо ў канцы чэрвеня, хоць яшчэ доўга знаходзяцца пад пільнай апекай сваіх клапатлівых бацькоў. Корміцца гэты імклівы сокал у асноўным мышамі, землярыйкамі, рыжымі палёўкамі, яшчаркамі, насякомымі Любіць сядзець наслупах, адзіночных дрэвах, з вышыні якіх асочвае здабычу. Але часцей за ўсё ў пошуках корму прыгожая птушка “патрулюе” гнездавы ўчастак у плаўным і няспешным палёце. Умее “стаяць” у паветры, колькі секунд узмоцнена трапечучы крыламі. Калі ахвяра на зямлі зазявалася, то праз момант яна ўжо ў моцных кіпцюрах спрытнага драпежніка.



У цёплыя краіны сокал-пустальга адлятае напрыканцы жніўня і ў верасні. Асобныя птушкі застаюцца зімаваць у Беларусі. Агульную колькасць гэтага рэдкага віду ў рэспубліцы на сучасны момант вучоныя ацэньваюць прыкладна ў 1700 пар. Адстрэл пустальгі і разбурэнне кладак караюцца па законе. На кармавую базу птушак адмоўна ўплывае прымяненне хімічных удабрэнняў, пестыцыдаў, змяненне севазваротаў на карысць монакультур. У Чырвоную кнігу Беларусі сокал-пусталыа занесены з 1981 года.

### ПУСТАЛЬГА

***Ляціць на пусткі з палясоўя,***
***Дзв мала дрэў і шмат кустоўя.***
***Здалёк усе ж наўрад ці льга***
***Пазнаць. што гэта пустальга.***
***Ды вось трапеча шустра крыллем —***
***Завісне ўміг над чарнабыллем.***
***Асочваць выганы, луп —***
***Такая звычка ў пуетальгі.***
***Палёўку згледзіць пад сабою —***

***Уніз куляецца стралою.***
***Бацькі палююць па чарзе —***
***Турбот хапав пусталізв.***
***З высокіх дрэў заўважыць зорка,***
***Дзе мыш, дзв суслікава норка.***
***«Малых ці пракарміць змагу?» —***
***Пытанне мучыць пустальгу.***
***Гнязда між тым, не робіць зроду:***
***Заняць чужыя мае моду.***
***Пейзаж пад жнівеньскай смугой***
***Слуп тэлеграфны з пустальгой.***
***Пярэднік жоўты, плашчык рыжы;***
***Каптурык шызы, позірк хіжы.***
***На чарнатропах, у лазе***
***Нялёгна выжыць пустальзе.***
***Таму і кружыць паўз даліны***
***Драпежнік з роду сакаліных.***

***В.Гардзей***

**Источник:** Настаўніцкая газета.-2010.-6 лют.-С.11.